


## СМЕЛАСЦЬ ГАРАДЫ БЯРЭ,

### альбо Хто не дбае, трасцу і мае...

Ёсць у мяне блізкая прыяцелька — ну вельмі цікавая жанчына! Вулкан! Энергетычны донар! Да яе, здараецца, ледзьве прыпаўзеш — стомлены, не здольны ні на што. Ну як той тэлефон без зарадкі. А пабач пасядзіш, пагутарыш, гарбаты пап'еш і глядзіш — нібы другое дыханне адкрылася: зноў бадзёранькі, дужы — горы можаш звярнуць!

Што цікава, гэтая вось энергія ўплывае не толькі на людзей. Многія запрашаюць Ганну да сябе на лецішчы, на гароды. Кажуць, яна там проста паміж градак паходзіць — «рукамі памахае, спадніцай патрасе», і ніякіх угнаеннаў ды паліваў не трэба: гародніна — як на дражджах расце!

У самой жа Ганны лецішча няма — пакуль... Мусіць, таму гадоў колькі назад яна пад балконам кветнік разбіла. Насадзіла ўсяго, насеяла — нешта квітнее ды зелянее там з ранняй вясны і да маразоў! Людзі ходзяць, любуюцца, а хто-ніхто нават прыклад бярэ.

— От каб і ў нас хто кветак насадзіў... Толькі не жоўтых, — памарыў неяк Сцяпанавіч, адзінокі мужчына з суседняга пад'езда.

А Ганне ж гэта як слова мовіць. Галоўнае — першы раз ускапаць. А там, глядзіш, нешта і зацвіло! Прыемна паглядзець, прыемна пасядзець на лавачцы: пагутарыць з суседкамі, павітацца з тым жа Сцяпанавічам. Ён, дарэчы, вельмі цікавы чалавек! Музыкант у мінулым...

— І ці не жаніх твой? — падколваюць Аню бабулі з лавачкі.

Тая — без роздуму і на поўным сур'ёзе:

— Ведаеце, замуж пакуль не кліча, але ж падарункі робіць...

Сказанула так і як быццам забылася, а плётка між тым птушкай абляцела двор, і, шчыра кажучы, вельмі азадачыла «жаніха». Ён нават збіраўся падысці да Ганны — высветліць, што ж яна мела на ўвазе? А потым задумаўся: а чаму б і сапраўды не зрабіць падарунак? Нават дарагі... Чаму б не ўзяць на сябе палiў клумбы (і сваёй, і Ганнінай)? Ён жа будзе лягчэй — гэта раз, сэканоміцца час, дарагая вада — гэта два... Чым не падарунак?

Прыдумана — зроблена.

...А пасля гэтага пыласос у Ганны зламаўся. Дужа стары быў: роў — не раўнуючы — як той трактар на вораве! Здаралася, пакуль яна тры пакоі свае прыбярэ (там яшчэ поўсць ад кошкі), у суседкі знізу галава разбаліцца — у дзверы грукае, просіць, каб выключала...

А тут — нічога не ўключаецца (Ганна адмысловую шчотку прыдбала), цішыня... І каторы ж тыдзень?

— Ты што — у хаце прыбіраць перастала? — пытае суседка ў Ані.

Тая ў адказ:

— Не... Што вы — прыбіраю па-ранейшаму... Проста Сцяпанавіч (хлусіць дык хлусіць! Ды і не адзін жа Гаўрыла ў Полацку!)... робат-пыласос падарыў.

Сказала вось так — і на гэты раз ужо не забылася: чакае, пакуль плётка, абляцеўшы ўсе лавачкі, «нырне» ў кватэру да Сцяпанавіча, пакуль той (інтэлігентны ж чалавек!) не падумае, што падарунак для такой жанчыны і сапраўды быў бы не лішні... А ўжо які?

Можа, канцэрт у двары наладзіць? Для ўсіх жыхароў... Вось бы свята было!

«Марыць, — кажа Анюта, — зусім не шкодна. Шкодна — не марыць. У любым узросце».

**А. Васільева,**

*г. Гомель.*

## СПРАВА МАЛАДАЯ

У пакоях інтэрната —
То хі-хі, а то ха-ха...
Там жывуць адны дзяўчаты —
Кожнай трэба жаніха.
Хлопец Вася — кучаравы,
Чуб — нібы ў казака.
Малады, худы, рухавы,
Ды... з наколкаю рука.
І як вып'ю, небарака,
Можа, лішніх сорак грам,
Стаў брахлівы, як сабака,
Што зусім не цешыць дам.
Праз гадзіну «клюнуў» Пеця.
Той — са стажам кавалер:
— Прыгажунечкі, прывецік! —
З месца ён бярэ ў кар'ер.
— Чулі новы анекдоцік?
Я іх тры пуды нашу:
Хоць кліентам на рабоце,
Хоць начальству раскажу...
Пры дзяўчатах захапіўся,
(Быў увагай падагрэты) —
У той жа міг прагаварыўся —
«З шафы
выцягнуў шкілеты»:
Пра дзяцей, што недзе мае,
Ды не хоча гадаваць,
Што з ахвотай абдымае,
Ды «не дурань замуж браць».
...Пасля Пеці быў Валера,
Потым — Паша і Вадзім.
Ды не тыя кавалеры,
У загс не пойдзеш ні з адным!
Дзеўкі многіх перабралі —
Ох-хо-хо ўжо, не хі-хі,
Бо ўпрочкі паўцякалі
Іх былыя жаніхі.
Ходзіць Вася з прыгажуняй,
І ў Пашы зноў раман...
Ну, і нашы дзве красуні
На вячоркі маюць план.
...Танцы скончаны. Дахаты
Разам з хлопцамі пайшлі.
Задаволены дзяўчаты,
Што хоць нейкіх ды знайшлі!
Як да неба — да Сталоне,
І няхай не Мікі Рурк...
Не казалі ім сягоння,
Каб зусім ужо «без рук».
...Янак —
тут жа абдымацца —
Аплявуху атрымаў.
Векавухаю застацца
Ён дзяўчыне пажадаў.
А яе сяброўку Толя
На інтым угаварыў.
Не прыйшоў да дзеўкі болей,
Нават след яго прастыў...

* * *

...Месяц поўны пазірае,
Нібы хоча ўсім сказаць:
Выбар — справа маладая,
З ім бы дроў не наламаць!

**Віктар Сабалеўскі,**

*г. Узда.*

## НЕ БЫЛО Б ШЧАСЦЯ,

### ды няшчасце падмагло

Гэту гісторыю (ці не векавой даўнасці?), вельмі цёплую, добрую, поўную гумару, любіла расказваць мая бабуля.

У іх на Мядзельшчыне ў вёсцы жыў адзін стары кавалер. У вочы яго звалі Аркадзем, за вочы — Дармідонт, бо ён вось гэтак на фэсце прадстаўляўся пастаўскім паненкам. Казаў, што самы сапраўдны шляхцюк, абуваў галёшы на боты, як Адольф Быкоўскі, змазваў алеем валасы, каб гладка ляжалі. А святочны касцюм, які надзяваў у касцёл, дык і наогул вешаў на кручок ажно пад абразамі.

Змоладу, карацей, ён слыў ганарлівым, і зусім не дзіўна, што пару сярод дзяўчат знайсці не мог. Гады ішлі, браты пажаніліся, бацькі памерлі, а Дармідонт (дзеўкі ўжо разбегаліся), па-ранейшаму хадзіў па вечарынках. На пытанні вяскоўцаў, калі ўжо пойдзе ў сваты, кавалер хіба жартаваў: «Калі крута закручу, дык, можа, і ў суботу». (Не казаў, у якую.)

...Так, напэўна б, і век звекаваў, але ж на нябёсах пастанавілі інакш...

Неяк познім велікодным вечарам, сп'яну выраблюючы фігуры, якія ні ў адным са сваіх шляхетных танцаў не здолеў бы паўтарыць сам Адольф Быкоўскі, плёўся Аркадзь з суседняй вёскі ад брата. Дарога перад ім не сказаць, каб была далёкая, але ж ён захацеў скарацiць: папхнуўся сцежкай праз кустоўе, збіўся з курсу — трапіў у балоцца. Пакружляў там, бедны, па купінах, пагубляў у твані галёшы...

І нічога — як бачыць — ужо не знайсці, бо сцямнела, стаміўся, спужаўся... А яно ж, калі трывога, то мы — да Бога.

Укленчыў Дармідонт пад асінкай і давай уголас маліцца — дапамогі прасіць.

Калі шчасціць, гасподзь прыходзіць... Альбо некага падсылае: у гэты ж час з Аркадзевай вёскі ў сваю (і такмама з гасцей — ведама, Вялікдзень!) вярталася цыбатая, даўганосая і смуглявая да чарнаты Марыля. Ёй добра за трыццаць было, і яна ўжо змірылася з тым, што застанецца ў дзеўках, бо ўсе ў акрузе лічылі яе непрыгожай (хоць прыгажосць, як вядома, паняцце адноснае і залежнае ад часу і моды...) Дык вось, пачула Марыля Аркадзевы модлы, падышла бліжэй, неяк выбавіла яго з балотца ды і павяла дадому, праўда, не да яго, а да сябе.

Што і як там далей было, ніхто не ведае, але ж праз тыдзень наш Дармідонт зняў з кручка святочны касцюм, павыцягваў з кішэняў пальцам (клаў ад молі і мышэй), на чаравікі абуў новенькія бліскучыя галёшы і, «крута закруціўшы», накіраваўся да Марылі ў сваты.

...Трохі пазней, пасля вяселля, ён усхваляваў баіў мужыкам:

— Знаеце, панове, а мне ж для гэткага шчасця нібы ў макаўку цюкнула. Сплю я, значыць, адзін і бачу, што пайшлі мы ў маліны. Ты, Янук, пайшоў, і ты, Мацей... Усе разам збіраем іх, як раптам перад сабой я бачу такую буйную, такую сакаўную малінку... І ўсе ж яе бачаць — цягнуць рукі свае, каб сарваць... А я самы першы злаўчыўся ды сашчыкнуў! Вось такая малінка мне і дасталася.

Мужыкі — каму б салоўку слухаць, а хто і варонінай песні рады — па-добраму пасмяяліся з тога вешчага сну. А на яве Аркадзь з Марыляй вельмі добра жылі, траіх дзяцей гадавалі. І звалі іх не Дармідонтавымі, не Аркадзевымі, а Малінчынымі.

**Алена Несцяронак,**

*г. Докшыцы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Ад яе ж, шчыра, як на духу: невялікі, на жаль, тыраж у «Звязды», не так шмат чытачоў і на сайце газеты, дзе, дарэчы, многія матэрыялы падаюцца на нашых абедзвюх мовах. А вось рубрыкі «...Народ на провадзе!», «Простая мова» і «Хто каго?» — найчасцей на адной, на першай з дзяржаўных. «Чаму?» — час ад часу цікавяцца чытачы.

Адказваем: гумар — гэта першае (і, згадзіцеся, галоўнае), што губляецца ў перакладах на іншую мову. А без яго, без прыгажосці роднай...

Як казаў знаёмы кухар: «Гатаваць трэба смачна. А не — дык не псуй прадукты». У нашым выпадку — не займай месца на газетнай старонцы ды на сайце, не забірай у чалавека час на прачытанне.

Яно ж так? Ці не? Пішыце!

---

Неасабісты суб'ектыў



# Людзі і справы

### І добрае, і наадварот вяртаецца-адгукаецца. Раней ці пазней — няважна

«Ні адна добрая справа не застанецца беспакаранай», — сумна жартавала сяброўка, калі чарговы раз сутыкалася з людской няўдзячнасцю і няпамятлівасцю. Мы толькі з разуменнем пасміхаліся, нібы ўсё пра гэта жыццё ведаем — нам жа ўжо было па дваццаць гадоў! А на агульнай кухні студэнцкага інтэрната на абкладзенай белай пліткай сцяне чорнай фарбай было напісана: «Я бачыў свет — у ім няма справядлівасці!» І дваццаціградовым гэта таксама здавалася нейкім надзвычай разумным і бясспрэчным выслоўем. Карацей, рабіць камусьці дабро няма ніякага сэнсу, хіба што для паразумення з уласным сумленнем. А яго, сумленне, можна прымусіць маўчаць, а калі не атрымаецца, дык проста да яго не прыслухоўвацца.

У бескарыснасці і нават шкоднасці рабіць штосьці добрае мы нашым дзявочым хаўрусам адной адначы пераканаліся асабліва аргументавана. Мы тады былі на трэцім курсе, прыжыліся ў адным пакоі, зрабілі там рамонт, жылі дружна і весела, усё ў нас было агульнае. У галодныя 1990-я здабывалі харчы як маглі: у кагосьці ў вёсцы бацькі трымалі гаспадарку, у кагосьці мацi была ўрачом і ёй прыносілі пачастункі «натурай», хтосьці прывозіў з першых камандзіровак кавалак сала ці вянок цыбулі ад героя ў матэрыялу... Жылі ў вялікім пакоі ўчатырох, але месца хапала, нават пяты ложак, які выкарыстоўвалі ў якасці агульнай канапы, стаяў.

А ўжо ў кастрычніку ў нас з'явілася яшчэ адна суседка — першакурсніца Наташа. Мы яе проста пашкадавалі — не знайшла паразумення з дзяўчатамі са свайго пакоя, скандал грымеў на ўвесь паверх і скончыўся тым, што гэтае маленькае дзяўчо са спалоханымі вачыма апынулася сярод ночы на калідоры разам з рэчамі. Карацей, знайшлі мы ёй месца на тым агульным ложку, так і засталася. Пяцікурсніцы, што яе выставілі з пакоя, былі дзеўкі ганарлівыя, абедзве працавалі недзе на тэлебачанні. Выжыўшы шэрую мышку, яны такім чынам забяспечылі сабе больш камфортнае пражыванне да канца вучобы, бо падсяляцца да гэтых фурый больш ніхто не захацеў...

Дык вось, Наташа, ціхая і паслухмяная Наташа, зусім незаўважная, якая нікуды не хадзіла, сядзела за падручнікамі ды часта бегала на паштамт званіць дадому, кудысьці ў вёску, здаецца, пад Лепелем, пасля першага семестра раптам знікла. Літаральна, зусім. З'ехала ў самы разгар сесіі, калі мы якраз здавалі экзамен, забраўшы ўсе свае рэчы і... увесь наш прадуктовы запас. Асабліва, памятаю, шкада было імпартнай тушонкі, дзве бляшанкі якой Таньчын бацька дастаў недзе па вялікім блаце. Стыпендыя была ўжо паспяхова патрачана, дадому ехаць ні ў кога не атрымлівалася. Карацей, усе астатнія дні сесіі мы прасядзелі на гарбаце і на хлебе з цукрам, ды пару раз схадзілі да хлопцаў на смажаную бульбу. Малую зладзейку, вядома, клялі, але не заяўляць жа было на яе ў міліцыю. Тым больш у дэканаце сказалі, што яна забрала дакументы і з'ехала ў невядомым напрамку...

ГЭТАЯ, па сутнасці, звычайная гісторыя незвычайная тым, што праз дваццаць пяць гадоў мела працяг. Расказала мне яго нядаўна адна з суседак па пакоі, тая самая Танька, чый бацька дастаў дэфіцытную тушонку. Яна ўжо даўно жыве за мяжой, прыязджае на радзіму нячаста. Але заўсёды знаходзім магчымасць сустрэцца, паўспамінаць студэнцкія гады...

«Угадай, каго сустрэла ў Стамбуле. Наташу! Як якую? Памятаеш тую малую, што ў нас усю ежу ўкрала...» Пачалося ўсё са здарэння, якое ледзь не стала трагедыяй. Яны з шасцігадовым сынам гулялі па вуліцах турэцкай сталіцы. Малы ўпусціў з рук цацку, якая ўпала на праезную частку. Маці не паспела вокам мірнуць — хлопчык ужо выскачыў на дарогу перад машынай. Добра, што нейкі бяздомны, што сядзеў на тратуары, паспеў выхапіць малога проста з-пад колаў... Перапалоханая жанчына стала на ламанай англійскай дзякаваць выратавальніку, а той, дапытаўшы, адкуль яна, радасна заўсміхаўся. Аказалася, ён штодня харчуецца ў дабрачыннай сталоўцы, гаспадыня якой таксама з Беларусі. Часта яна сама прыходзіць на раздачу ежы, і сёння якраз такі дзень.

Карацей, пайшоўшы паглядзець на зямлячку, Тацццяна пазнала нашу былую суседку, якую не раз успаміналі нядобрым словам. Тая, аказваецца, ужо даўно ўдала выйшла замуж за турка. Настолькі ўдала, што нябедны муж дазволіў ёй займацца ўласным бізнесам — у яе свае рэкламнае агенцтва, якое працуе з разлікам на рускамоўных кліентаў. «Зарабляе, казала, добрыя грошы, але ўсе іх траціць на дабрачынныя сталоўкі для бяздомных і маламаёмных, якіх адкрыла некалькі ў розных гарадах... Казала, усё дзякуючы нам. Прасіла прабачэння, каб усім вам перадала. У яе тады ў бацькоў за ноч згарэла ўся сядзіба, добра, што самі жывыя засталіся. І яна, разумеючы, што вывучыць яе ўжо ніхто не здолее, забрала дакументы і, прыхапіўшы нашы харчы, панеслася дадому, дзе бацькі і малодшая сястра засталіся на папялішчы. Расказвала — першыя некалькі дзён тым, што прывезла з Мінска, і харчаваліся...»

МЫ яшчэ доўга разважалі, як цікава зладжана жыццё, як усё пераплецена, як усё — і добрае, і наадварот — вяртаецца-адгукаецца, часам зусім нечакана. Вось не звезла б Наташа нашы харчы — не адчувала б сябе вінаватай і павіннай — не адкрыла б тую сталоўку — не заходзіў бы туды бяздомны — быў бы ў іншым месцы ў той час, калі хлопчык бег пад машыну...

А сёння сястра зранку расказала. Аднавяскоўка, які трымае добрую гаспадарку, раптам прынёс шчодрыя гасцінцы. «Колькі я табе павінна?» — спыталася. «Нічога. Я ўсё жыццё памятаю, як ваш бацька згадзіўся ўзяць мяне на работу пасля восьмага класа. Ніхто не браў малога, а ён, брыгадзір, узяў. Мой бацька якраз памёр, маме з намі дваімі цяжка было. А я стаў зарабляць амаль дзевяноста рублёў. І гэта такая палёгка нам была... Так што нічога вы мне не павінны...»

Нашы малыя будуць са смакам частавацца дамашнімі гасцінцамі — падзякай за адну добрую справу іхняга прадзеда... Якога ўжо няма на свеце трыццаць сем гадоў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**